ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 30 (125) | Субота, 14 кастрычніка 1972 г. | Год выдання 4-ты | Цана 2 кап.

## У ПАРТКОМЕ

12 кастрычніка адбылося чарговае пасяджэнне партыйнага камітэта універсітэта.

На ім у члены КПСС былі прыняты Т. В. Касцючэнка і В. Е. Стахоўскі, а кандыдатам у члены КПСС Ю. Ф. Хадакоўскі.

Была зацверджана камісія па святкаванню 55-й гадавіны Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі.

Члены партыйнага камітэта разгледзелі таксама шэраг арганізацыйных і кадравых пытанняў.

## ВІНШУЕМ!

**Партыйны камітэт, рэктарат, прафесарска-выкладчыцкі састаў і студэнты нашага універсітэта горача віншуюць загадчыка кафедры педагогікі і псіхалогіі ІВАНА ФЕДАРАВІЧА ХАРЛАМАВА з паспяховай абаронай дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук.**

# У СТУДЭНЦКАЙ СЯМ'І





Нямнога часу прайшло з той пары, як сённяшнія першакурснікі з гордасцю назвалі сябе студэнтамі. Некалькі тыдняў — зусім нямнога, калі ўспомніць, што ўперадзе — 5 гадоў, неспакойных, шчаслівых студэнцкіх гадоў. Але гэта і не малы тэрмін: за плячыма ўжо ёсць пройдзены шлях — праца на калгасных палях вобласці, першыя праслуханыя лекцыі, першыя адказы на семінарах — усё першае. Тое — што надоўга запамінаецца. Але ёсць сярод гэтых дзён такі, які застанецца ў памяці назаўсёды.

Урачыстае пасвячэнне ўчарашніх абітурыентаў у студэнты Гомельскага дзяржаўнага універсітэта адбылося ў мінулую суботу.

Яшчэ задоўга да назначанага часу да галоўнага корпуса універсітэта пацягнулася святочная плынь першакурснікаў. Урачыстыя і ўсхваляваныя, зай малі яны месцы ў актавай зале. Прыйшлі сюды і іх старэйшыя таварышы, каб павіншаваць новае папаўнанне з гэтай значнай падзеяй у студэнцкім жыцці.

Заціхае перапоўненая актавая зала. Месцы ў прэзідыуме займаюць кіраўнікі універсітэта, прафесары і выкладчыкі, выдатнікі вучобы. Сакратар партыйнага камітэта ГДУ Усевалад Васільевіч Казлоў прадастаўляе слова прарэктару па навуковай рабоце доктару эканамічных навук, прафесару Міхаілу Веніямінавічу Навучыцелю. Ён горача віншуе юнакоў і дзяўчат з уступленнем у студэнцкую сям'ю і гаворыць аб тых задачах, якія стаяць перад моладдзю. Званне савецкага студэнта — ганаровае званне. Яно заклікае да паўсядзённай працы ў вучобе, актыўнасці ў грамадска-палітычным жыцці. Стаць маладым савецкім спецыялістам, высокаадукаваным знаўцам сваёй справы — сённяшні абавязак першакурснікаў.

Шчаслівa свецяцца твары ўчарашніх абітурыентаў. Прафесар М. В. Навучыцель уручае першакурснікам сімвалічны студэнцкі білет. Яго прымаюць студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта Людміла Беразоўская і Аклясандр Чухнюк.

Студэнт першага курса фізічнага факультэта Максім Аўчыннікаў ад імя сваіх таварышаў дае ўрачыстую клятву.

Затым Ленінскі стыпендыят, студэнтка пятага курса гісторыка-філалагічнага факультэта Надзежда Шабан ад імя ўсіх студэнтаў і выкладчыкаў перадае першакурснікам сімвалічны ключ ад універсітэта. Яго прымае студэнтка гісторыка-філалагічнага факультэта Ада Дзмітрашкіна.

На вечары вялікай групе першакурснікаў з ліку слухачоў падрыхтоўчага аддзялення ўручаны ганаровыя граматы за выдатную работу на будаўнічых аб'ектах Гомеля.

Гэта свята пасвячэння надоўга застанецца ў памяці юнакоў і дзяўчат. І няхай кожны з іх памятае словы вялікага пралетарскага пісьменніка Аляксея Максімавіча Горкага: «Гісторыя ўсклала на вас, моладзь, вялікую працу — быць прапаведнікам новых адносін да чалавека, настаўнікамі будовы новага жыцця. Гэта абавязвае вас дружна і прылежна вучыцца, перш за ўсё вучыцца. Чым больш ведае чалавек, тым ён мацней...»

**НА ЗДЫМКАХ:** сакратар парткома Усевалад Васільевіч **Казлоў** адкрывае свята пасвячэння першакурснікаў у студэнты. Ленінскі стыпендыят, студэнтка пятага курса гісторыка-філалагічнага факультэта Надзежда Шабан уручае сімвалічны ключ ад універсітэта Адзе Дзмітрашкінай. Студэнцкі білет у моцных руках Людмілы Беразоўскай і Аляксандра Чухнюка, Максім Аўчыннікаў (злева) дае ўрачыстую клятву. Намеснік сакратара камітэта камсамола будаўнічага трэста № 14 Анатоль Гарохаў уручае ганаровую грамату студэнту першага курса фізічнага факультэта, камісару будатрада «Альба-72» Мікалаю Клімовічу.





## КЛЯТВА ПЕРШАКУРСНІКАЎ

**Мы, студэнты першага курса Гомельскага дзяржаўнага універсітэта, у гэты святочны дзень пачатку новага перыяду нашага жыцця, уліваючыся ў рады слаўнага савецкага студэнцтва, урачыста клянёмся:**

**Быць да канца вернымі справе вялікага Леніна, Камуністычнай партыі і савецкага народа, свята захоўваць і памнажаць вялікія заваёвы сацыялізму;**

**КЛЯНЕМСЯ!**

**З усёй страсцю маладых сэрцаў упарта і настойліва авалодваць тайнамі навук, памнажаць сілу розуму чалавека;**

**КЛЯНЕМСЯ!**

**З пачуццём вялікай адказнасці несці святло ведаў у гушчу народных мас, выхоўваць савецкую моладзь у духу беззапаветнай адданасці высакародным ідэалам камунізму;**

**КЛЯНЕМСЯ!**

**Клапатліва захоўваць і памнажаць лепшыя традыцыі студэнцкай моладзі: дружбу, дапытлівасць, высокую грамадскую актыўнасць, вернасць камсамольскаму слову;**

**КЛЯНЕМСЯ!**

**Быць да канца адданымі сваёй навуковай спецыяльнасці і зрабіць усё магчымае для яе развіцця і ўдасканалення;**

**КЛЯНЕМСЯ!**

**Быць дастойнымі і актыўнымі ўдзельнікамі станаўлення новага свету — будаўніцтва камунізму;**

**КЛЯНЕМСЯ!**

**Захоўваць у нашых сэрцах светлае пачуццё любві да нашага універсітэта, садзейнічаць яго працвітанню і славе;**

**КЛЯНЕМСЯ!**

**Мы будзем заўсёды захоўваць вернасць гэтай нашай урачыстай клятве!**

**КЛЯНЕМСЯ! КЛЯНЕМСЯ! КЛЯНЕМСЯ!**

